Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку

*М.М. Караткоў* (Магілёў)

## ВОБРАЗ ІГНАТОВІЧА
## Ў РАМАНЕ І. ШАМЯКІНА «АТЛАНТЫ І КАРЫЯТЫДЫ»

Вельмі важную ролю ў мастацкай структуры рамана адыгрывае сюжэтная лінія першага сакратара гаркома партыі Ігнатовіча. Яе вылучэнне, думаецца, было абумоўлена жаданнем пісьменніка больш выразна выявіць свой погляд на праблему метадаў партыйнага кіраўніцтва.

Тады, у 60-я – 70-я гады, да нас ужо дакаціліся першыя хвалі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. На кіраўнічыя пасады ў партыйных органах пачалі масава вылучацца спецыялісты розных галін вытворчасці. Гэта былі кіраўнікі так званага «новага тыпу», да якіх належыць і Ігнатовіч. У адрозненне ад многіх прадстаўнікоў старэйшага пакалення партыйных работнікаў, такіх, як першы сакратар абкома партыі Сасноўскі, яны былі больш адукаванымі, добра ведалі сучасную тэхніку і тэхналогіі. З вытворчасці яны прыўнеслі ў новую для сябе сферу дзейнасці рацыяналізм у арганізацыі справы, што ўвогуле было вельмі дарэчы. Горш было тое, што большасць з іх, перайшоўшы на партыйную работу з гаспадарчай, ставіліся да чалавека, як да выканаўцы пэўных, дакладна вызначаных функцый, за межы якіх выходзіць нельга. І не звярталі ўвагі на духоўны свет чалавека, які для партыйнага кіраўніка па ідэі павінны быў быць галоўным клопатам.

Палемізуючы ў думках з Сасноўскім, які, наадварот, надаваў вялікае значэнне духоўнаму аблiччу, ведаў і памятаў тысячы людзей, з якімі даводзілася сутыкацца, Ігнатовіч зазначае: «Паспытаў бы ты, Леанід Мінавіч, гаспадарчага хлеба, з якога пачынаў ён, інжынер Ігнатовіч. Там псіхалогія – справа другарадная. Ходзячы на імяніны да рабочых, прадукцыйнасці працы не паднімеш» [1, с. 161]. На яго думку, такая ўвага да людзей «зусім не абавязковая для кіраўніка новага тыпу, якому трэба ажыццяўляць кіраўніцтва па-навуковаму, з прымяненнем навейшай тэхнікі і новых метадаў» [1, с. 161]. Заўважым, што Ігнатовіча мала цікавіць маральны патэнцыял, сутнасць нават блізкіх людзей. Як гэта ні парадаксальна, але нават Карнача, сябра і сваяка, ён фактычна не ведае, бо абмяжоўвае свае дачыненні з ім перш за ўсё дзелавой сферай. Таму і не разумее сапраўдных прычын яго ўчынкаў.

Увогуле Ігнатовіч – чалавек, на першы погляд, неблагі: яму не адмовіш ў розуме, руплівасці і адказнасці ў выкананні службовых абавязкаў, уменні арганізаваць работу падначаленых. Нарэшце, у імкненні зрабіць «свой» горад лепшым за многія іншыя ва ўсіх адносінах, у тым ліку і ў архітэктурных. Як кіраўнік, мае бясспрэчныя вартасці і заслугі, чым не без падстаў і ганарыцца. Гэта ж Ігнатовіч ацаніў талент Карнача і прапанаваў яму пасаду галоўнага дойліда і даў непараўнальна большую, чым у яго калег, свабоду ў вырашэнні архітэктурных пытанняў. Падтрымаў ідэю Карнача аб будоўлі новага раёна горада па індывідуальнаму праекту, сам разам з ім і Шугачовым рыхтаваў і накіроўваў у вышэйшыя інстанцыі просьбу аб дазволе на такое будаўніцтва і выдзяленне адпаведных сродкаў.

Аднак погляд на чалавека як на выканаўцу пэўных функцый, абмежаванасць раз і назаўсёды вызначанымі для сябе рамкамі магчымага і дазволенага, шкодзяць самому Ігнатовічу, а яшчэ больш – справе, якой ён павінны служыць. Заўважым, што галоўным клопатам гэтага чалавека з'яўляецца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«адпавядаць». Адпавядаць званню сем'яніна, бацькі, камуніста-кіраўніка, сваёй пасадзе, патрабаванням статута партыі, маральнага кодэксу будаўніка камунізму, пастаноў партыі і ўрада, вышэйстаячых органаў, рознага роду інструкцый – нават у дробязях. Менавіта ў гэтым ён бачыць галоўны крытэрый свайго прэстыжу ў вачах падначаленых і кіраўніцтва. Таму ў неадназначных сітуацыях заўсёды стараецца папярэдне ўзгадніць свае дзеянні з вышэйстаячымі інстанцыямі, перш за ўсё з Сасноўскім.

У прынцыпе, нічога кепскага ў гэтым як быццам бы і няма. Сумесная дзейнасць у любой сферы жыцця патрабуе арганізацыі, дакладнага размеркавання абавязкаў і сумленнага іх выканання кожным, захавання пэўных правіл і нормаў паводзін. Аднак нават у самых разумных пастановах, інструкцыях, немагчыма прадугледзіць усе калізіі нават дня сённяшняга, не кажучы ўжо пра заўтрашні. А жыццё між тым ідзе, ставячы задачы, што патрабуюць новых рашэнняў, часам рызыкі, парушэння існуючых нормаў і правілаў. Ігнатовіч такога сабе не дазволіць, што прыводзіць да страты таго сапраўды чалавечага, што ў ім ёсць.

Намер Карнача развесціся з жонкай, яго выявіўшаяся сімпатыя да сакратаркі Ігнатовіча, накіраванне без згоды апошняга ліста з пратэстам супраць «пасадкі» хімічнага камбіната ў Белым Беразе ствараюць немалыя праблемы першаму сакратару гаркома партыі. Яны ўспрымаюцца ім як недаравальнае парушэнне ўсіх норм чалавечых і службовых адносін, што кідае цень і на яго аўтарытэт. І таму Ігнатовіч дае ход заяве жонкі Карнача, якая патрабуе пакараць мужа за намер развесціся з ёй. А ў дадатак накіроўвае ў архітэктурнае ўпраўленне камісію на чале з людзьмі, якія зробяць усё, каб знайсці падставы для звальнення яго кіраўніка.

У час абмеркавання асабістай справы Карнача на бюро гаркома партыі Ігнатовіч стараецца захаваць бачнасць бесстароннасці і прынцыповасці ў сваіх паводзінах. Ён загадзя прадумаў, як зрабіць, каб і козы былі цэлыя, і ваўкі сытыя: «Вырашыў, суровай вымовы <…>, не запісваць. Члены бюро згодзяцца, што вызваленне ад пасады – кара немалая, для каго іншага – найвышэйшая. Але ён, Ігнатовіч, ведае, што для такога архітэктара, як Карнач, – гэта не трагедыя. А ўлічваючы адносіны з Дашай, для Максіма гэта будзе найлепшае выйсце. Вызвалены ад працы, але з чыстай уліковай карткай, ён, безумоўна, адразу ж паедзе ў Мінск ці іншы горад, можа, нават за межы рэспублікі, бо нішто яго не трымае тут, – і справа будзе закрыта. Назаўсёды. Для яго, Ігнатовіча, будзе закрыта. Ён будзе пазбаўлены ад Карначовых фартэляў, ад праблем, якія той бясконца стварае сваёй дзейнасцю, сваім неспакойным характарам. Некалі гэты характар галоўнага архітэктара добра памагаў старшыні выканкома Ігнатовічу. Але цяпер у такім памочніку няма патрэбы» [1, с. 328]. Як бачым, Ігнатовіч клапоціцца найперш пра сябе, а не



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пра людзей, не пра агульную справу. Па сутнасці, Ігнатовіч сам належыць да таго мяшчанства, з якім вядзе, як думае, актыўную барацьбу.

Пасля звальнення Карнача нішто, здаецца, не пагражае аўтарытэту Ігнатовіча і не замінае рабіць тое, што, на яго погляд, з'яўляецца адзіна правільным. І пагадзіцца на «пасадку» хімічнага камбіната ў Белым Беразе, не зважаючы на довады Карнача, што гэта пашкодзіць гораду і яго жыхарам. Бо будаўніцтва такога прадпрыемства – як падарунак, адмовіцца ад якога – несусветнае глупства, якога ні ён сам сабе, ні начальства яму не даруе. Гэта ж і рабочыя месцы, і фінансы, і жыллё, і аб'екты сацкультбыту.

У глыбіні душы Ігнатовіч прызнае правату Карнача, разумее яго клопат пра будучыню горада, паважае за смеласць і прынцыповасць. «Ні перад чым чалавек не спыніўся: ні перад пагрозай звальнення, вымовы, разрыву сяброўства. <...> Сам ён спыняецца і адступае часцей, апраўдваючы гэта тым, што на яго месцы інакш нельга. <...> А яшчэ з'явілася дзіўнае адчуванне: як бы ён нешта страціў ці ў чым атрымаў паражэнне ад невядомага праціўніка. Сапраўды дзіўна. Што ён мог страціць? Хто і ў чым мог яго перамагчы?» [1, с. 332-333].

Ігнатовіч страціў дружбу чалавека, які не дазваляў спыніцца ў развіцці, даваў прыклад шчырасці, незашоранага погляду на рэчаіснасць, адданасці справе. Але наўрад ці зразумее гэта Ігнатовіч, а калі і зразумее, то малаверагодна, што зменіцца хоць у нечым.

**Літаратура:**

1. *Шамякін, І.П.* Збор твораў. Т. 4: Атланты і карыятыды. Губернатар. Раманы / І.П. Шамякін.– Мінск: Маст. літ., 2004. – 463 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова